ПРЫБОРКА БЕЗ ЛЯНОТЫ І КАПРЫЗАЎ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

Подкуп — таксама прыём далёка не бясшкодны. Па-першае, «манетызаваныя» патрабаванні, напрыклад, прымаць душ увечары або прыбірацца ў пакоі, ствараюць у дзіцяці ілюзію, што гэтыя дзеянні неабходны не яму, а бацькам. Па-другое, малое хутка прызвычайваецца, што яго ўчынкі маюць пэўны кошт, і ў далейшым можа адмаўляцца ад выканання просьбаў, не падмацаваных матэрыяльна. Нарэшце, фарміруецца ўяўленне, што ўсё можна купіць — і сяброўства, і ўвагу, і каханне. Таму растлумачыць потым такія паняцці, як узаемадапамога, альтруізм, спачуванне, можа быць вельмі цяжка.

Трэцяя памылка сустракаецца ў бацькоў, якія стаміліся чакаць ад дзіцяці актыўнасці і вырашылі навесці ў яго пакоі парадак самастойна. Дачка ці сын такія дэманстратыўныя пакуты не ацэняць, а вось высновы зробяць: у яго здольнасці спраўляцца з цяжкасцямі дарослыя сумняваюцца (пахіснецца ўпэўненасць у сабе); калі пацягнуць час, праблема вырашыцца за кошт мамы ці таты; бацькі не адказваюць за свае словы, таму можна просьбы не выконваць. Так што прыбраць за дзіця можна, але гэта пазбавіць яго матывацыі наводзіць чысціню ў далейшым.

Падыход па ўзросце

Пачынаць вучыць прыбіраць у кватэры трэба з ранняга дзяцінства. Аднак перш за ўсё неабходна адаптаваць «вучэбны матэрыял» пад узрост малога.

Да 5 гадоў прыборку можна ператварыць у пазнавальную гульню з замацаваннем ведаў аб навакольным свеце, напрацоўкай карысных навыкаў і развіццём здольнасцяў. Напрыклад, прапануйце сабраць і рассартаваць цацкі па колеры, форме або прызначэнні: лялькі — у адну скрыню, машынкі — у другую, кубікі — у трэцюю і г. д. Папрасіце дзіця растлумачыць свой выбар.

З 6 гадоў і да малодшага падлеткавага ўзросту навядзенне чысціні павінна выклікаць цікавасць. Лепш за ўсё ўводзіць у працэс элементы гульняў і спаборніцтваў. Так, можна прапанаваць дзіцяці стаць дэтэктывам, які шукае пакінутыя рэчы і вяртае іх на месца. Даволі папулярная таксама гульня — «паход у грыбы»: раскіданыя прадметы «ператвараюцца» ў грыбы, якія трэба сабраць. Для большай захапляльнасці можна разам прыдумаць ім назвы: «накрэслікі», «заканапік», «падложачнік» і іншыя.

> Пры вялікім беспарадку можна прапанаваць дзіцяці знайсці пэўную рэч. Напрыклад, схавайце любімую цацку — няхай паспрабуе адшукаць яе сярод раскіданых прадметаў. Страціўшы надзею знайсці, малы сам возьмецца за прыборку.

Старайцеся пазбягаць аднастайнасці. Навучыцца наводзіць чысціню з дапамогай такіх звычайных рэчаў, як губка і швабра, дзіця яшчэ паспее. Прыдумвайце нестандартныя даручэнні, увядзіце ў дзіцячы інвентар для барацьбы з хаосам незвычайныя інструменты: дазвольце выкарыстоўваць яркую мяцёлку для пылу, самаробны фартух, на які разам наляпіце прыгожую аплікацыю, цацачны пыласос. Няхай працэс прыборкі будзе звязаны з прыемнымі асацыяцыямі.

> Калі ў сям'і некалькі дзяцей, можна арганізаваць спаборніцтвы, накшталт «хто хутчэй збярэ паперкі?» або «хто лепш пазбавіцца ад пылу на паліцах?» з невялікімі прызамі ўдзельнікам. Дарэчы, фармат чэленджу можа быць і «дзеці супраць бацькоў». Такія гульні спрыяюць напрацоўцы навыкаў каманднай работы і паляпшэнню ўзаемаадносін у сям'і.

У падлеткавы перыяд з-за імклівай перабудовы арганізма дзеці часта адчуваюць моцную стомленасць і апатыю. Акрамя таго, пачынаецца пераасэнсаванне свайго «я» і месца ў свеце. Бацькі ператвараюцца ў стрымальную сілу, таму любыя іх просьбы і патрабаванні ўспрымаюцца ў штыкі і альбо ігнаруюцца, альбо выконваюцца з дакладнасцю да наадварот. Аднак справіцца можна і з юнымі бунтарамі.

У першую чаргу давядзецца прызнаць права падлетка на асабістую прастору. Дзіцячы пакой у гэтым узросце ўспрымаецца як своеасаблівая крэпасць, дзе можна адпачыць ад перажыванняў і пераасэнсаваць падзеі, якія адбываюцца ў жыцці. Таму перш чым заходзіць у памяшканне, пастукайце ў дзверы. Правядзенне прыборкі лепш узгадняць загадзя. Дайце юнаку зразумець, што прыбраць трэба, але дамоўцеся аб зручным для яго часе.

Здараецца, беспарадак выкліканы не столькі лянотай, колькі недахопам месца для захоўвання рэчаў.

Выйсці са становішча дапамогуць кошыкі, скрынкі і арганайзеры. Аднак падлетка трэба ўключыць у іх падбор, тады на жаданні мець сваё «логава» можна няблага сыграць. Растлумачце, што як частка кватэры дзіцячы пакой павінен быць чыстым і акуратным, але яго інтэр'ер — гэта выбар тынейджара. Тады ён з энтузіязмам возьмецца за захаванне чысціні ў створанай прасторы, бо будзе адчуваць за яе адказнасць.

Яшчэ важны момант — канкрэтызуйце патрабаванні. Часам з-за віру думак юнакі не заўважаюць брудныя талеркі, абгорткі, вопратку ў кутках. Лепш удакладніць: «Я хачу, каб ты падняў майку і паклаў яе ў шафу, сабраў паперкі і выкінуў, памыў талеркі і падлогу». Прастымуляваць гэтыя дзеянні дазволіць падрыхтоўка прасторы: праветрыце, пакладзіце на бачнае месца смеццевыя пакеты, пастаўце кантэйнеры для бруднай бялізны і рознай дробязі і г. д.

Не патрабуйце навядзення парадку, калі ў падлетка няма настрою. Пазбаўляцца ад стрэсу пры дапамозе веніка і шуфліка здольны не кожны, а надта частае і настойлівае «капанне на мозг» прывядзе да фарміравання ўстойлівага непрымання прыборкі.

> Будзьце прыкладам для пераймання. Патрабаванні прыбраць у пакоі не павінны зыходзіць ад чалавека, які спакойна існуе ў хаосе. Дзіця больш рэагуе на ўчынкі, а калі яны адрозніваюцца ад слоў... У вас дома пануюць чысціня і парадак? Значыць, і падлетак будзе мімаволі іх падтрымліваць.

Александрына ПАРШЫНА.

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ПАКАШТУЙЦЕ!

КАПУСНАЯ САЛАТА З ЧАРНАСЛІВАМ І ГРЭЦКІМІ АРЭХАМІ

Спатрэбіцца: *белакачанная капуста — 0,5 кг; морква — 1 шт.; чарнасліў без костачак — 50 г; арэхі грэцкія ачышчаныя — 50 г; лімон — 1 шт.; смятана — 2 ст. л.*

Чарнасліў вымыць і замачыць у цёплай вадзе на 10 хвілін. Капусту тонка нашаткаваць. Моркву надзерці на буйной тарцы.

Змяшаць капусту з морквай, паліць сокам лімона, пасаліць і як след, з сілай перацерці. Чарнасліў адкінуць на друшляк, нарэзаць невялікімі кавалачкамі. Арэхі пасекчы ў буйную дробку. Дадаць у капусту чарнасліў, арэхі і цэдру лімона. Змяшаць і паставіць у халадзільнік на 20 хвілін. Перад падачай заправіць смятанай.

БУЛЬБЯНЫЯ ВАТРУШКІ З ФАРШАМ

Незвычайныя ватрушкі, асновай якіх з'яўляецца не цеста, а бульбяное пюрэ. У якасці начынкі выкарыстаны свіны фарш, яго можна замяніць на ялавічны або курыны.

Спатрэбіцца: *бульба — 700 г; мясны фарш — 300 г; яйка — 1 шт.; мука — 2 ст. л.; соль, чорны молаты перац — на смак; сыр цвёрды — 100 г; смятана — 2 ст. л.; алей — 1 ст. л.*

Бульбу ачысціць, вымыць і адварыць да гатоўнасці ў падсоленай вадзе. Гатовую бульбу расцерці ў пюрэ.

Даць крыху астыць, затым убіць яйка і ўсыпаць муку. Усё добра перамяшаць. Бульбяная маса павінна атрымацца не вадкай.

Фарш абсмажыць на алеі на працягу 10-15 хвілін на невялікім агні, перыядычна памешваючы і разбіваючы мясныя камячкі, затым пасаліць і паперчыць.

З бульбяной масы мокрымі рукамі сфарміраваць невялікія аладкі таўшчынёй прыкладна 1,5 см. Выкласці іх на бляху, засланую пергаментам.

Кожную аладку прамазаць смятанай.

Зверху выкласці абсмажаны фарш, не даходзячы крыху да краёў.

Зверху на фаршы размеркаваць надзёрты на тарцы сыр.

Адправіць бульбяныя ватрушкі з фаршам у разагрэтую да 180 градусаў духоўку на 20-25 хвілін.

Смачныя, апетытныя, з румянай скарыначкай ватрушкі гатовыя. Даць ім крыху астыць, затым зняць з бляхі з дапамогай драўлянай лапаткі і падаваць на стол.

ПІРОГ З ЯБЛЫКАМІ «СПАКУСЛІВЫ»

Спатрэбіцца: для цеста: *мука — 200 г, масла ці маргарын — 125 г, яйкі курыныя — 3 шт., цукар — 125 г, соль — 1 дробка, ванільны цукар — 1 пакуначак, разрыхляльнік — 3 ч. л., вяршкі — 3 ст. л., яблыкі — 600 г, лімонны сок — 20 мл.* ***Для заліўкі:*** *смятана — 200 г, цукар — 75 г, яйкі курыныя — 2 шт., цукровая пудра — 1 ст. л.*

Масла, соль, цукар і ванільны цукар расціраем у місцы. Уводзім па адным яйку. Муку ўводзім часткамі, разам з разрыхляльнікам. Дадаем вяршкі.

Выкладваем цеста ў форму, змазаную алеем ці маслам.

Яблыкі абіраем, разразаем на чацвярцінкі, выдаляем сарцавіну, апырскваем лімонным сокам. Выкладваем яблыкі на цеста, злёгку ўціскаючы.

Выпякаем пры 175-180 °С каля 15 хвілін.

Заліўка: змешваем смятану, яйкі, цукар.

Пірог дастаём з духоўкі і паліваем заліўкай. Выпякаем яшчэ 50 хвілін.

Гатовы пірог астуджаем і пасыпаем цукровай пудрай.

ДРУГОЕ ЖЫЦЦЁ

ЦЁПЛЫЯ ТАПАЧКІ

Калі ў вас дзесьці заляжалася непатрэбная рэч са штучнага футра, ці ёсць проста асобныя футравыя кавалачкі, то за 20-30 хвілін вы лёгка можаце пашыць цёплы хатні абутак і парадаваць свае ножкі або зрабіць цудоўны падарунак родным і блізкім.

Рыхтуючы матэрыялы да шыцця, паглядзіце, як размешчаны ворс, каб усе дэталі выкрайкі раскласці ў адным напрамку. Лякалы можна лёгка зрабіць самім. Звярніце ўвагу, што дэталі вусцілкі трэба выразаць люстранымі.

Выразаўшы дэталі, састрыжыце футра па краях на шырыню прыпускаў — так швы атрымаюцца больш тонкімі, а шыць будзе лягчэй. Пасля гэтага такія ж дэталі неабходна выразаць з трыкатажу, напрыклад кулеркі.

Дэталі верху (і з трыкатажу, і з футра) складаем напалову добрым бокам унутр і пракладваем радок па задніку.

Далей складаем дэталі верху з абодвух матэрыялаў і сшываем па верхнім зрэзе. Перад гэтым прыпускі швоў на задніку трэба акуратна расправіць. Потым дэталі вывараччваем, выпростваем і адпарваем, не націскаючы на прас, каб не сапсаваць мех.

Далей па ніжнім зрэзе фіксуем трыкатаж і футравую тканіну паміж сабой шпількамі.

Сколваем дэталь верху з вусцілкай. Паварочваем дэталь вусцілкі так, каб пасля вывараччвання футра апынулася ў сярэдзіне тапачка.

Пасля гэтага засталося толькі пракласці радок па крузе, вывернуць тапачкі, акуратна адпарыць, і наш абутак гатовы!

ХАТУ МЯЦІ, А СМЕЦЦЕ НА ВУЛІЦУ НЕ НЯСІ (БЕЛАРУСКАЯ НАРОДНАЯ ПРЫМАЎКА).